Беларусь.info

№93 13/07/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*

**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**Аляксандр Казулін асуджаны на пяць з паловай гадоў калоніі.** Нагадаем, Аляксандр Казулін быў арыштаваны 25 сакавіка падчас жорсткага разгону спецназам апазіцыйнай дэманстрацыі. Суд над палітыкам пачаўся 6 ліпеня ў судзе Маскоўскага раёну сталіцы. За гэты час суддзя не задаволіў ніводнага хадайніцтва Казуліна і яго абароны. 12 ліпеня экс-кандыдата ў прэзідэнты наогул выдалілі з залы суду і пазбавілі апошняга слова. На абвяшчэнні прысуду прысутнічалі толькі адвакаты і адзін прадстаўнік дыпламатычнай місіі, астатнія былі выдаленыя з залы суда.

**Ідзе другі тыдзень галадоўкі берасьцейскіх прадпрымальнікаў.** У галадоўцы, якую пачалі 5 ліпеня чатыры прадпрымальнікі-ўладальнікі маршрутных таксі, на сёньняшні дзень удзельнічаюць 11 чалавек. Ніякай рэакцыі на гэтую акцыю пратэсту з боку берасьцейскіх уладаў пакуль няма. Усе раней заплянаваныя сустрэчы з прадастаўнікамі мясцовай вэртыкалі скасаваныя. Удзельнікі галадоўкі скардзяцца, што іхняе здароўе пагаршаецца — гэта зьвязана і з надзвычайнай сьпёкай апошніх дзён. Аднак спыняць сваёй акцыі не зьбіраюцца, пакуль не адменяць рашэньня падатковых органаў спагнаць з прадпрымальнікаў так званы рэспубліканскі збор

**Малады Фронт» атрымаў афіцыйны адказ на патрабаванні ўдзельнікаў галадоўкі, якая адбывалася ў траўні-чэрвені сёлета.** Адказ прыйшоў з Галоўнага ўпраўлення ўнутраных справаў Мінгарвыканкаму. Маладафронтаўцам патлумачылі, што іх галадоўка была несанкцыянаваная, таму што яе арганізатары не паведамілі ўладам пра месца і час, калі яны павінны былі галадаваць. Таму выкананне патрабаванняў акцыі немагчымае, гаворыцца з дакуменце, падпісаным намеснікам старшыні Галоўнага ўпраўлення ўнутраных справаў Уладыкам.

**Міністэрства адукацыі Нідэрландаў прадстаўляе праграму для навучання ў краіне 100 беларускіх студэнтаў.** Аб гэтым паведаміў сябра студэнцкай групы "Місія для Беларусі" Олівер ван Лоа. Лоа зазначыў, што сябры групы звярнуліся ў міністэрства з ініцыятывай аб прадастаўленні ва ўніверсітэтах Нідэрландаў месцаў для студэнтаў з Беларусі, якія не могуць працягваць навучанне па палітычных прычынах. У красавіку кіраўніцтва міністэрства ў афіцыйнай заяве пацвердзіла, што адшукае такую магчымасць. Беларусы атрымаюць стыпендыю ад ураду Нідэрландаў, якая пакрые таксама страхоўку і інтэрнат. На праект плануецца выдаткаваць каля 1 мільёна еўра.

**Апошнюю маёмасьць “Белай Русі”.** Колісь адна з самых магутных у краіне камэрцыйных структураў “Белая Русь”, падпарадкаваная Кіраўніцтву справаў прэзыдэнта, пазбаўляецца апошняй маёмасьці. Як расказалі былыя супрацоўнікі кампаніі, днямі пачнецца распродаж аўтамабіляў і аргтэхнікі, што ацалелі пасьля арыштаў і штрафных санкцыяў. Нагадаем, што канец “Белай Русі” быў пакладзены затрыманьнямі ў 2004 годзе яе кіраўнікоў, уключна з кіраўніцай справаў прэзыдэнта Галінай Жураўковай.

# Абвесткі

**Новы конкурс – «Фота Свабоды».** «Фота Свабоды» – Ваш погляд на беларускае жыццё. Дасылайце (з кароткім апісаннем – што, дзе, калі) здымкі падзеяў, сітуацыяў, людзей на адрас svaboda@rferl.org з пазнакай “fota Svabody”. Падрабязнасці на www.svaboda.org